СЛЯДЫ КРЫЛАТАГА ПЕГАСА

Уладзімір ЦЕРАБУН у «акружэнні» сваіх знакамітых землякоў - Віктара Роўды і Аляксандра Дзяругі.

Багатая фантазія старажытных грэкаў парадзіла гэту дзіўную істоту – крылатага каня. Хаця, калі шчыра, вялікага напружання не патрэбна, каб, назіраючы за гэтымі грацыёзнымі жывёламі, уяўляць усю прыгажосць палёту, імклівага і адначасова магутнага руху...

Хлапчукі пасляваеннага пакалення, да якога адносіцца і Уладзімір Церабун, вельмі рана адчулі сябе дарослымі, дапамагаючы бацькам, вымушаным адбудоўвацца, абжывацца пасля ваеннага ліхалецця. Але спытайце любога з іх, і пачуеце ў адказ, што найлепшай забавай і найвялікшым шчасцем для вясковага ці местачковага хлапчука былі паходы ў начное, магчымасць пакатацца вярхом на коніку.

Уладзімір Васільевіч успамінае, што на лесазаводзе, дзе працаваў яго тата, былі прыгожыя нямецкія коні. Назіраючы за імі, пільны і ўражлівы хлопчык адчуў невытлумачальную патрэбу нейкім чынам адлюстраваць характар, спыніць цудоўнае імгненне. У той час ён яшчэ не мог нават здагадвацца, што такім чынам праяўляецца імкненне да творчасці. Яго першым "натуршчыкам" стаў прыгожы конь Сівак – увасабленне моцы, імклівасці, грацыёзнасці. Замалёўкі на паперы не давалі магчымасці перадаць шматбаковасць і сімвалізм формы, таму наступным крокам сталі спробы выразаць драўлянага коніка. Балазе, асінавых і ліпавых абрэзкаў, якія калі-нікалі прыносіў з лесазавода бацька, хапала.

Але першае і сур'ёзнае судакрананне з мастацтвам скульптуры адбылося ў школьным гуртку. Затым настаўнік працоўнага навучання Віталь Раленка паказаў асновы фармавання. Гліну для формаў бралі ў кар'еры пад Алянцом. Мяккі падатлівы матэрыял ператвараўся ў руках умельца ў нескладаныя гіпсавыя фігуры і формы.

Дзіцячае захапленне вызначыла далейшы жыццёвы шлях Уладзіміра Церабуна, а конік, вобраз якога калісьці падштурхнуў хлопчыка да творчасці, часта станавіўся для скульптара звычайным памагатым у штодзённай цяжкай працы, і з алегарычнага Пегаса ператвараўся ў цяглавую сілу, пакідаючы на бездарожжы глыбокія сляды падковаў, а ў чыстым полі помнік – мемарыяльны комплекс "Дальва".

Яшчэ студэнтам-трэццякурснікам тэатральна-мастацкага інстытута Уладзімір Церабун перамог на конкурсе праектаў, які быў абвешчаны сярод беларускіх майстроў з мэтай увекавечання памяці ахвяраў спаленай вёсачкі Дальва. Пазней работа была адзначана прэміяй Ленінскага камсамола Беларусі. Дарэчы, у 2005 годзе адбылася рэканструкцыя гэтага комплексу, з'явіліся новыя элементы-помнікі. Напрыклад, адзінокія арэлі, калодзеж-журавель. Сярод іншых самы ўражлівы – стол памяці: на металічным стылізаваным ручніку 44 місачкі (па колькасці загубленых тут дарослых) і яшчэ 29 – столькі тут закатавалі дзетак.

(Заканчэнне на 3-й стар.).

ЧАС - УПЕРАД!

25 сакавіка 2007 года ў адпаведнасці з парадкам вылічэння часу на тэрыторыі краіны будзе здзейснены пераход на «летні» час. Такім чынам, 25 сакавіка ў 2 гадзіны ночы стрэлкі гадзінніка пераводзяцца на адну гадзіну ўперад.

ЧЫСТЫ СІГНАЛ

Пашыраецца і даволі ўстойліва працуе ў нашай краіне сетка мабільнай сотавай сувязі. Пастаянна павялічваецца колькасць карыстальнікаў мабільных тэлефонаў і на Смаргоншчыне. Спецыялісты кампаній VELCOM і МТС, якія працуюць у нашым паўночным рэгіёне Гродзеншчыны, імкнуцца павялічваць ёмістасць сетак і паляпшаць якасць сотавай сувязі.

З гэтай мэтай сумеснае таварыства з абмежаванай адказнасцю "Мабільныя ТэлеСістэмы" неўзабаве распачне будаўніцтва каля вёскі Дабраўляны ў саўгасе "Лыпойці" базавай станцыі. На падставе хадайніцтва ТАА "МТС" раённы выканаўчы камітэт зацвердзіў нядаўна акт выбару зямельнага ўчастка плошчай 0,24 га пад будаўніцтва такога аб'екта.

Ян ІВАНЧЫК.

Пал ці прапаў?

Узмоцнена адказнасць за выпальванне сухой расліннасці і распальванне вогнішчаў у забароненых месцах.

З уступленнем у дзеянне з пачатку сакавіка Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях, парушэнне правілаў пажарнай бяспекі, якія сталі прычынай знішчэння ці пашкоджання лесу або тарфяніку, цягне накладанне штрафу ў памеры ад 25 да 50 базавых велічынь. Правядзенне выпальванняў караецца штрафам ад 10 да 40 базавых велічынь, а распальванне вогнішчаў у забароненых месцах - пакараннем або штрафам у памеры да 12 базавых велічынь.

Станіслава ЗАЛЕСКАЯ.

Погода

СРЕДА 21.03	ЧЕТВЕРГ 22.03	ПЯТНИЦА 23.03
ночью: +5...+7	ночью: +4...+6	ночью: +4...+6
днем: +9...+11	днем: +9...+11	днем: +11...+13
Облачно. Без осадков. Атмосферное давление днем: 740 мм рт. ст., но-	Облачно с прояснениями. Без осадков. Атмосферное давление днем: 746 мм рт.	Ясно. Без осадков. Атмосферное давление днем: 754 мм рт. ст., ночью: 751 мм. рт. ст.

СЛЯДЫ КРЫЛАТАГА ПЕГАСА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

Праца скульптара-манументаліста (а ў гэтым напрамку ды яшчэ ў дробнай пластыцы і станковай скульптуры, пераважна і працуе Уладзімір Васільевіч) патрабуе і немалых фізічных намаганняў. Таму і не дзіва, што яго татэм – конь, жывёла дужая і працавітая, і разам з тым, па высакароднаму зграбная. Аднойчы, калі ўзнікла неабходнасць перадаць мовай скульптуры вобраз мітуслівага, магутнага, ўсёперамагаючага часу і злучыць яго бег з космасам, з сімфоніяй Сусвету, майстар увасобіў усе свае думкі і разуменне непераможнасці жыцця, стварыўшы кампазіцыю "Бег" у выглядзе імклівага табуна.

"Сонца можа не ўзысці, а заняткі па скульптуры будуць", - такімі словамі напачатку сваёй выкладчыцкай дзейнасці ў гродзенскім мастацкім вучылішчы пачынаў урок Уладзімір Васільевіч. Гэты жарт вучні, якія да яго прыходу навучыліся ляпіць толькі зорку, успрымалі як заклік да дзейнасці і з прагай творчасці "асмоктвалі" новыя і карысныя веды. А яму даводзілася самому распрацоўваць навучальныя праграмы, займацца добраўпарадкаваннем майстэрні, набыццём абсталявання. Сур'ёзнае стаўленне да творчасці, дысцыплінаванасць, імкненне да новых ведаў, да глыбокага авалодання спецыяльнасцю – усяго гэтага патрабаваў Уладзімір Церабун ад сваіх вучняў. Дарэчы, і дачку Наталлю яны з жонкай Валянцінай выхоўвалі на такіх прынцыпах. У выніку цяпер скульптар мае ў асобе дачкі паплечніка, аднадумцу, дарадцу і памочніка.

Патрабавальнасць да іншых у яго спалучаецца з высокай патрабавальнасцю да сябе. Нядаўна Уладзіміра Васільевіча назвалі самым шчодрым аўтарам Смаргоншчыны: ён падарыў смаргонскаму гісторыка-краязнаўчаму музею шэсць сваіх работ. Свой учынак майстар патлумачыў наступным чынам:

- Гэты падарунак – знак удзячнасці землякам, якія радуюцца маім поспехам. Нават прысваенне мне звання "Заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь", як мне падалося, з большай радасцю ўспрынялі смаргонцы, чым я сам. А ўвогуле, я вельмі ўдзячны раённым уладам, з якімі заўжды знаходзіў і знаходжу агульную мову, у якіх меў падтрымку. Дарэчы, і аб прысваенні звання хадайнічаў райвыканкам.

Як сапраўдны творца, Уладзімір Церабун жыве новымі задумамі, з радасцю адклікаецца на прапановы тых, хто ведае і цэніць яго як мастака, майстра сваёй справы. Помнік супрацоўнікам міліцыі ў Гродне ён стварыў па просьбе генерала Анатоля Белашэўскага. З прадастаўленых праектаў генерал не ўхваліў ніводнага і звярнуўся да Церабуна, чые творчыя магчымасці і густ былі яму добра вядомыя. Не так даўно скульптар атрымаў запрашэнне да супрацоўніцтва ад Анатоля Арцімовіча, праект якога, прысвечаны ахвярам І сусветнай вайны на Смаргоншчыне, перамог на конкурсе ў мінулым годзе і цяпер чакае свайго ўвасаблення.

Ён быў сярод ініцыятараў устанаўлівання мемарыяльнай Дошкі Аляксандру Анісімавічу Дзяругу.

Ала СТРАШЫНСКАЯ.

СПЕШ

В КОПИЛ ПОЛЕЗНЫХ

В 2006 году правле... ...ской общественной ор... Белорусского фонда ме... ...ровалось собрать по 2... добровольных взносов... на каждого жителя райо... заданием мы справили... ли 12 миллионов рубле... нили двукратное подве... по привлечению добр... взносов в копилку фонд... і місто в области сре... районных организаций.

Достичь высоких р... помогли трудовые колле... приятий, учреждений об... культуры, спорта, торго... ления и отделы райи... сельсоветов и сельско... ных организаций районо... никто не отказал. В этой... ной акции участие при... 90 трудовых коллективо... – учреждения образова...

Сострадание и доб... заслуживают самых теп... годарности. Особую приз... хочется выразить всем... лям, принимавшим акти... в пропаганде "благородн... задач Белорусского фо... большую организаторску... сбору добровольных по... Значительный вклад в ко... ного фонда внести агре... РУП «Белоруснефть – Гр... тепродукт», отдел внут... редакция газеты «Свет... «Жилищно-коммунальн... ство», ПЧУП «Сморгонск... хлебопродуктов», гимна... ние школы №3 и №7, О... узел почтовой связи, хле... деление ОАО «БелАГП... русбанк», РОЧС, ДРОЦ... ляна», отдел культ... «Сморгонская школа-с... сад №15, центральная ра... ница, СПК «Жодишки»... Белковщинский сельски... лы и управления райис...

НА «ПРАМОЙ ЛІНІІ» - ДЗЯРЖА...